# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН РЭКТАРАТА, ПАРТКОМА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 28 (152) 4 снежня 1990 года


## ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

### *На справаздачна-выбарным сходзе*

26 лістапада прайшоў справаздачна-выбарны сход партыйнай арганізацыі універсітэта. Сакратар парткома універсітэта Уладзімір Канстанцінавіч Пчэльнік выступіў са справаздачным дакладам, які ў скарочаным выглядзе змешчаны на другой старонцы газеты.

Пасля абмеркавання даклада адбыліся выбары сакратара і членаў партыйнага камітэта, а таксама старшыні і членаў кантрольнай камісіі.

У спісы для тайнага галасавання па выбарах сакратара парткома былі ўнесены дзве кандыдатуры: Івана Платонавіча Крэня, загадчыка кафедры гісторыі БССР і Уладзіміра Канстанцінавіча Пчэльніка, дэкана факультэта бесперапыннай адукацыі. У выніку праведзенага галасавання, большасцю галасоў сакратаром парткома універсітэта зноў абраны **У. К. Пчэльнік.**

У састаў партыйнага камітэта ўвайшлі:

**Ануфрык Славамір Сцяпанавіч**, дацэнт, загадчык кафедры квантавай электронікі;

**Балыкін Аляксандр Сяргеевіч**, інжынер першай катэгорыі навукова-даследчага сектара;

**Бадакоў Аляксандр Васільевіч**, прафесар, рэктар універсітэта;

**Бойка Валерый Канстанцінавіч**, дацэнт кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў;

**Васілючак Міхаіл Вікенцьевіч**, прарэктар па завочнаму і вячэрняму навучанню;

**Вувунікян Юрый Мікіртычэвіч**, загадчык кафедры алгебры, геаметрыі, функцыянальнага аналізу і методыкі матэматыкі;

**Гарбачоў Віталій Паўлавіч**, старшы выкладчык кафедры дзяржаўнага, працоўнага і сельскагаспадарчага права;

**Жарскі Міхаіл Васільевіч**, прафесар, загадчык кафедры палітычнай гісторыі;

**Іванчук Барыс Міхайлавіч, дацэнт кафедры палітычнай гісторыі;**

**Крэнь Іван Платонавіч**, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі БССР;

**Малышка Вітольд Вітольдавіч**, намеснік сакратара камітэта камсамола;

**Нядзелька Уладзімір Антонавіч**, дацэнт кафедры палітычнай гісторыі;

**Пугачоў Аляксандр Мікалаевіч**, студэнт 2 курса факультэта правазнаўства;

**Ярмусік Эдуард Станіслававіч**, дацэнт кафедры гісторыі БССР.

Старшынёй кантрольнай камісіі абраны **Васіль Васільевіч Сянько,** начальнік навукова-даследчага сектара.

Членамі кантрольнай камісіі абраны **Грыцэнка Барыс Фёдаравіч,** начальнік аддзела кадраў; **Зорын Георгій Аляксеевіч**, дацэнт, загадчык кафедры крымінальнага права, працэсу і крыміналістыкі; **Козел Валерый Міхайлавіч**, студэнт другога курса гістарычнага факультэта і **Ягоўдзік Канстанцін Пятровіч**, начальнік вылічальнага цэнтра.

# *ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОЎ У ВНУ БЕЛАРУСІ*



* * *

**Рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя ва універсітэце**

* * *



Гэтай тэме была прысвечане Рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя, якая праходзіла 21-22 лістапада 1990 года ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы. З уступным словам да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуўся прарэктар па навучальнай рабоце прафесар С. А. Габрусевіч.

На плянарным паседжанні было заслухана 6 дакладаў, з якімі выступілі: дацэнт З. П. Данільчык, заг. кафедры беларускай мовы нашага універсітэта — «Сістэма арганізацыі дыпломнага праектавання студэнтаў-філолагаў», прафесар П. У. Сцяцко, заг. кафедры беларускай культуры нашага універсітэта — «Сучасны беларускі правапіс і заканамернасці нацыянальнай мовы», дацэнт В. І. Маслоўскі, інспектар упраўлення ВНУ і педагагічнай адукацыі Міністэрства народнай адукацыі БССР — «Закон аб дзяржаўнасці беларускай мовы і шляхі яго рэалізацыі», прафесар Л. А. Мурына, заг. кафедры методыкі рускай мовы і літаратуры БДУ —«Арганізацыя навукова-даследчай працы студэнтаў пры чытанні спецыяльных курсаў», прафесар І. А. Кісялёў, заг. кафедры рускай мовы Мінскага педінстытута —«Выкладанне сучаснай рускай мовы на нефілалагічных факультэтах ВНУ ва ўмовах беларуска-рускага двухмоўя», дацэнт М. І. Канюшкевіч, заг. кафедры рускай мовы нашага універсітэта — «Формы арганізацыі самастойнай працы студэнтаў».

На паседжанні таксама выступілі: дырэктар інстытута мовазнаўства АН БССР А. І. Падлужны, які спыніўся на некаторых пытаннях беларускага правапісу; намеснік дырэктара рэспубліканскага вучэбна-метадычнага кабінета Міністэрства народнай адукацыі БССР Г. М. Шабека, якая расказала пра новыя ўмовы выдання навучальнай літаратуры для сярэдніх і вышэйшых навучальных установаў у 1991 годзе; загадчыца кафедры беларускай мовы і нацыянальнай культуры мінскага інстытута замежных моў А. С. Сакалоўская, якая выказала свае думкі аб прачытаных дакладах; заслужаны настаўнік БССР М. М. Данільчык, расказаўшы пра асаблівасці падрыхтоўкі настаўнікаў мовы і літаратуры ў школах БССР.

22 лістапада працавалі секцыі і іх падсекцыі. На секцыі «Беларуска-рускія моўныя кантакты» праслуханы і абмеркаваны даклады: «Руска-беларускае моўнае кантактаванне апошняга часу» дацэнта А. І. Цімашэнкі, «Беларуска-рускія эквіваленты з рознай формай» ст. выкладчыка Л. І. Смольскай, «Пра спецыфіку намінацыі адцягненага дзеяння ў рускай і беларускай мовах» дацэнта Н. С. Конанавай. У абмеркаванні дакладаў прынялі ўдзел прафесары В. М. Нікіцевіч, А. І. Падлужны, П. У. Сцяцко.

У секцыі «Методыка выкладання моў у ВНУ» (падсекцыя 2) з дакладамі выступілі: дацэнт В. Л. Лешчанка — «Асаблівасці выкладання курса «Асновы культуры мовы і стылістыкі» ва ўмовах Беларусі», Г. Н. Жданеня — «Арганізацыя і змест лабараторных заняткаў па курсе методыкі рускай мовы», прафесар І. Я. Лепешаў — «Фарміраванне некаторых уменняў на занятках па фразеалогіі», дацэнт М. А. Даніловіч — «Збіранне фразеалагізмаў метадам апытання», Н. М. Нямкевіч — «Спецыфіка выкладання беларускай мовы на неспецыяльных факультэтах:, дацэнт М. М. Паночка — «Аптымізацыя навучання рускай мове ў педагагічных інстытутах». Асобным пытанням выкладання і даследавання фразеалогіі ў этнакультуралагічным асвятленні прысвяцілі свае выступленні дацэнт У. І. Каваль і аспірантка І. Г. Еўтухова.

«Канцэпцыя моўнай адукацыі ў сярэдніх навучальных установах рэспублікі» — тэма абмеркавання на паседжанні круглага стала. Канцэпцыя, выкладзеная на старонках »Настаўніцкай газеты» за 10 кастрычніка 1990 года, была ўхвалена.

Удзельнікі канферэнцыі наведалі літаратурна-краязнаўчы музей у вёсцы Гудзевічы Мастоўскага раёна. Зачаравана слухалі мы расказ-каментарый да экспанатаў музея яго дырэктара і заснавальніка — заслужанага дзеяча культуры Беларусі, выдатніка народнай адукацыі, былога настаўніка Гудзевіцкай СШ Алеся Мікалаевіча Белакоза. Наведнікі музея ўвачавідкі пераканаліся, як шмат можа зрабіць нават адзін чалавек для адраджэння беларускай нацыянальнай культуры, калі ён сапраўдны патрыёт сваёй Бацькаўшчыны, роднага краю.

На заключным паседжанні была прынята рэзалюцыя па пытаннях, што абмяркоўваліся на канферэнцыі.

**П. СЦЯЦКО.**

*Справаздачы і выбары ў партыйнай арганізацыі*

# АНАЛІЗ СУЧАСНАГА СТАНОВІШЧА. УРОКІ НА БУДУЧАЕ.

Шмат значных падзей у жыцці партыі адбылося пасля апошняга справаздачна-выбарнага сходу. У ліпені завяршыў сваю работу 28 з 'езд КПСС, прыняўшы Праграмную заяву, Статут КПСС і шэраг іншых дакументаў. У якой меры ён апраўдаў надзеі камуністаў? Адказ, безумоўна, залежыць ад таго, хто і якія надзеі ўскладаў. Тыя, хто прадказваў раскол КПСС, разачараваны. З 'езд паказаў, што КПСС мае сапраўды дэмакратычныя, стваральныя сілы, здольныя вывесці партыю і грамадства з цяперашняга крызісу, не дапусціць ні кансерватыўнага тармажэння працэсаў перабудовы, ні іх бяздумнага і звышрадыкальнага паскарэння, штурхаючага краіну ў бездань сацыяльных патрасенняў.

Хочацца спадзявацца, што і 31 з 'езд КПБ апраўдае ўскладзеныя на яго надзеі. Праект Статута КПБ мы абмяркоўвалі на партыйным сходзе, усе заўвагі па ім былі накіраваны ў адрас камісіі па падрыхтоўцы з 'езда, перададзены дэлегатам нашай вобласці, прапанаваным у састаў рэдакцыйнай камісіі. Паглядзім, у якой меры яны будуць улічаны.

У жніўні прайшла гарадская справаздачна-выбарная канферэнцыя. Тры нашыя камуністы абраны ў выбарныя органы: два ў састаў гаркома — І. П. Крэнь — загадчык кафедры гісторыі БССР, Я. У. Піульскі — загадчык кафедры сацыяльна-палітычных тэорый і паліталогіі. На пленуме ГК КПБ Я. У. Піульскі абраны членам бюро. У. К. Пчэльнік абраны членам кантрольнай камісіі гарадской партарганізацыі.

Завяршыла сваю работу абласная справаздачна-выбарная канферэнцыя. Два нашыя камуністы абраны ў састаў кіруючых органаў абласной партыйнай арганізацыі. Рэктар універсітэта А. В. Бадакоў абраны членам абкома партыі, загадчык кафедры палітычнай гісторыі М. В. Жарскі абраны членам кантрольнай камісіі Гродзенскай абласной партыйнай арганізацыі і членам прэзідыума кантрольнай камісіі.

Адна думка ўзнікла ў мяне ў ходзе канферэнцыі. Аб нашых вучоных-грамадазнаўцах заўсёды ўспамінаюць, калі трэба ісці да прапагандыстаў, на прадпрыемствы з тлумачэннем ідэй партыі. Аднак пра іх вельмі рэдка ўспамінаюць пры падрыхтоўцы партыйных рашэнняў. На мой погляд, іх удзел на гэтай стадыі дазволіць палепшыць якасць прымаемых дакументаў. Лічу, што правільна робіць Гродзенскі гарком КПБ, прыцягваючы двух нашых дацэнтаў на работу па сумяшчальніцтву ў свой апарат.

Трэба выказаць сур 'ёзны папрок парткому універсітэта і асабіста сакратару за тое, што ніякай сур 'ёзнай барацьбы ў сваіх партыйных акругах за нашых прадстаўнікоў не вялося. Кандыдата ў дэлегаты на 28 з 'езд мы на партыйным сходзе зусім не змаглі вылучыць. А кандыдат у дэлегаты на 31 з 'езд КПБ не змог атрымаць перамогі.

Не праявіў партком і патрэбнай аператыўнасці і настойлівасці ў арганізацыі выбарнай кампаніі па выбарах у Саветы за прадстаўнікоў універсітэта. Мы імкнуліся прытрымлівацца закону аб выбарах. А трэба было дапамагчы нашым кандыдатам у падборы давераных асоб, стварыць групы падтрымкі. 16 прадстаўнікоў партыйнай арганізацыі універсітэта змагаліся за дэпутацкія мандаты ў Саветы розных узроўняў, у тым ліку 4 члены парткома, а абраны толькі адзін. Дэпутатам абласнога Савета абраны студэнт факультэта правазнаўства Я. М. Насань. Важна вынесці з гэтай кампаніі ўрокі на будучае.

Завяршыліся справаздачна-выбарныя сходы на ўсіх факультэтах, за выключэннем фізічнага і інжынернага. Сакратарамі партыйных бюро зноў абраны: В. К. Бойка — матэматычны факультэт, Б. М. Іванчук (філалагічны), У. А. Нядзелька (біялагічны), Э. С. Ярмусік (гістарычны), В. П. Гарбачоў (фак. правазнаўства), М. В. Васілючак (партарганізацыя адміністрацыйна-гаспадарчай часткі), А. С. Балыкін (партарганізацыя НДСа), на факультэце педагогікі і методыкі пачатковага навучання сакратаром абраны В. К. Шыцік.

На шэрагу факультэтаў у састаў партыйных бюро не ўвайшлі дэканы. Гэта становішча патрабуе дадатковага аналізу. Партком універсітэта лічыць, што любы кіраўнік-камуніст у складаны для партыі час не павінен ухіляцца ад выканання пастаяннага партыйнага даручэння, якім з 'яўляецца работа ў саставе бюро. Трэба прызнаць, што многія камуністы-загадчыкі кафедраў не маюць пастаянных партыйных даручэнняў.

Раней у нас было прынята крытыкаваць выкладчыкаў грамадскіх навук за тое, што яны чыталі вельмі шмат лекцый па лініі таварыства «Веды» перад насельніцтвам. Памойму, сёння мы павінны сказаць дзякуй камуністам У. Я. Ягорычаву, Г. М. Крывашчокаму, І. А. Змітровічу і іншым, якія сёння ў такі цяжкі час не баяцца ісці да людзей, адстойваць партыйную пазіцыю.

Некалькі слоў пра сістэму партыйнай вучобы. У справаздачны перыяд вёўся пошук новых форм, усе правы па яе арганізацыі былі перададзены факультэцкім партыйным арганізацыям. Гэты вопыт не ўсюды сябе апраўдаў. Разлічваць, што сёння, калі студэнты маюць права на свабоднае наведванне заняткаў, мы зможам адрадзіць сістэму палітычнай вучобы ў яе старым выглядзе, не прыходзіцца. Аднак работа па адстойванню партыйных адзнак — адна з самых важных, і весці яе неабходна з улікам новых умоў.

Хацелася б разлічваць, што стварэнне факультэта грамадскіх навук (дэкан І. Д. Розенфельд) дазволіць аб 'яднаць намаганні ўсіх грамадазнаўцаў у правільным тлумачэнні студэнтам, супрацоўнікам і выкладчыкам сённяшняга становішча, усёй складанай і цяжкай гісторыі нашай дзяржавы. У першую чаргу неабходна арганізаваць цыкл лекцый, дыскусій для студэнтаў па ўсіх пытаннях, якія шырока абмяркоўваюцца ў друку, на тэлебачанні, даць ім адзнаку. Такая сістэматычная работа вядзецца толькі кафедрай палітычнай гісторыі. Патрэбен пошук новых форм палітычнай вучобы камуністаў. Новаму саставу парткома трэба падумаць аб арганізацыі пры парткоме пастаяннадзейнічаючага семінара або дыскусійнага клуба.

У верасні на агульнауніверсітэцкім партыйным сходзе мы вырашылі, што з 1.01.91. 50 працэнтаў сумы партыйных узносаў у адпаведнасці са Статутам КПСС ідзе на патрэбы нашай пярвічнай партыйнай арганізацыі. Паводле прагнозаў у 1991 годзе ў нашым распараджэнні застанецца 5—6 тысяч рублёў. Каштарыс мы будзем зацвярджаць на асобным партыйным сходзе. Тут я хачу прыцягнуць вашу ўвагу да гэтага пытання і ўнесці некаторыя прапановы. Трэба падумаць аб адлічэнні некаторай сумы ў фонд абароны студэнта. Неабходна прадугледзець сродкі для аказання матэрыяльнай дапамогі камуністам. Патрэбен і фонд для падтрымкі нашых прадстаўнікоў у выбарчых кампаніях. Нейкая частка сродкаў пойдзе на арганізацыю мерапрыемстваў, якія праводзіць партком. Якую частку сродкаў мы вылучым на даплату сакратару парткома, заахвочванне партыйнага актыву? Як будуць будавацца ўзаемаадносіны паміж парткомам і партарганізацыямі факультэтаў пры рашэнні фінансавых пытанняў?

Аднак у кастрычніку партыйны сход факультэта правазнаўства прымае рашэнне:

1. Пакідаць у сваім распараджэнні 50 працэнтаў узносаў, сабраных у кастрычніку.

2. Да даходаў, з якіх выплачваюцца партыйныя ўзносы, адносіць толькі даходы па асноўнаму месцу работы. Такое рашэнне, прынятае юрыстамі, якія з павагай павінны адносіцца да законаў, мяне здзівіла. Ёсць Статут КПСС, і калі мы, як члены партыі, яго прызнаем, то яго трэба выконваць. З 1-га студзеня 50 працэнтаў нашых узносаў будуць захоўвацца на рахунку гаркома партыі і расходавацца па нашаму рашэнню на патрэбы партарганізацыі універсітэта. Калі ж мы хочам мець свой рахунак, то неабходна выкарыстаць прадастаўленае §40 Статута КПСС права: «Пярвічныя партыйныя арганізацыі могуць карыстацца правамі юрыдычнай асобы ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам». Дык давайце ж даручым новаму саставу парткома сумесна з камуністамі факультэта правазнаўства ажыццявіць гэта права для партарганізацыі універсітэта.

За справаздачны перыяд колькасць нашай партыйнай арганізацыі вырасла на 10 чалавек і складае сёння 250 камуністаў. За апошні год уступіла ў партыю 10 чалавек. Не было прынята ў партыю ні аднаго чалавека на філалагічным, фізічным і матэматычным факультэтах, у адміністрацыйна-гаспадарчай частцы. За гэты час падалі заявы аб выхадзе з КПСС 6 чалавек.

Сёння ў адпаведнасці са Статутам КПСС права канчатковага прыёму ў КПСС у нас дадзена факультэцкім партарганізацыям. Аднак пасля XXVIIIз 'езда КПСС у адпаведнасці з новым Статутам у нас прыняты толькі адзін чалавек. Ёсць шмат нашых выпускнікоў, працуючых ва універсітэце, маладых выкладчыкаў, студэнтаў, якія могуць папоўніць партарганізацыю універсітэта. Толькі ў гэтым годзе 10 выпускнікоў пакінуты для работы ва ўніверсітэце. На мой погляд, новаму саставу парткома неабходна будзе надаць гэтаму пытанню значна большую ўвагу.

Колькасць камуністаў сярод студэнтаў катастрафічна памяншаецца. Мэтазгодна падумаць аб прыёме ў КПСС лепшых студэнцкіх актывістаў, тых студэнтаў, якіх мы добра ведаем. У мінулыя гады для ўліку думак студэнтаў у састаў парткома выбралі аднаго студэнта. Гэта сябе не зусім апраўдала. Неабходна падумаць аб другіх формах уліку меркаванняў студэнтаў у рабоце нашай партарганізацыі. Можа праз абранне ў партком кіраўнікоў студэнцкіх аб 'яднанняў, якія з 'яўляюцца членамі партыі.

Трэба прызнаць, што канкрэтныя рашэнні, якія прымаў партком універсітэта ў справаздачны перыяд, аказаліся недастаткова эфектыўнымі. Становішча мянялася настолькі хутка, што за ім не паспявалі ніякія пастановы.

Вылучыць асабісты ўклад кожнага члена парткома ў агульную справу даволі цяжка. У цэлым, усе члены парткома спраўляліся са сваімі абавязкамі, аб 'ектыўную адзнаку іх рабоце дадуць камуністы.

Галоўныя клопаты парткома ў гэтых умовах заключаліся ў тым, каб разам з адміністрацыяй забяспечыць стабільнае становішча ў калектыве, не дапусціць негатыўнага развіцця падзей. Аператыўнасць праявіў рэктар у разборы спрэчкі студэнтаў вакол курса грамадзянскай абароны і медпадрыхтоўкі... Савет універсітэта даў адказы на ўсе пытанні, і канфлікт не разгарэўся далей. Былі прадпрыняты крокі па наладжванню дыялога з прадстаўнікамі БНФ у нашым універсітэце. Ва ўсялякім выпадку, гэта работа павінна быць прадоўжана і новым саставам парткома.

З верасня 1990 года змяніўся статус сакратара парткома універсітэта. Не ўсе, магчыма, згодны з тым, што сакратар працуе на 0,5 стаўкі па сумяшчальніцтву. Асноўны аргумент—у такі цяжкі час сакратар павінен працаваць на стаўку, поўнасцю прысвячаючы сябе партыйнай рабоце.

Чым сёння павінна займацца наша партыйная арганізацыя? Хацелася б выказаць некаторыя прапановы па гэтаму пытанню.

**Першае.** Партыйная арганізацыя канкрэтнымі справамі павінна даказаць неабходнасць свайго існавання ў калектыве універсітэта. Яе дзейнасць павінна прыносіць карысць не толькі партыі, але і калектыву універсітэта.

**Другое.** Мы павінны праяўляць клопат аб якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Добрыя ідэі прапанаваны нашымі камуністамі А. В. Бадаковым, В. П. Таранцеем у галіне давузаўскай і паслявузаўскай адукацыі. Частку з іх удалося рэалізаваць.

**Трэцяе.** Трэба думаць аб тым, як выжыць калектыву універсітэта ва ўмовах рынку. Стварыць умовы, каб выкладчык сваёй працай мог зарабіць больш. Вялікія рэзервы схаваны ў платных адукацыйных паслугах. У гэтым годзе прыбытак факультэта бесперапыннай адукацыі склаў амаль 250 тыс. рублёў. У перспектыве ён павінен узрасці да 1 мільёна. Важным з 'яўляецца той факт, што мы выкарыстоўваем патэнцыял тых факультэтаў, якія сур 'ёзна не задзейнічаны ў арганізацыі гаспадарча-дагаворных навукова-даследчых работ.

**Чацвёртае.** Неабходна ўзнавіць дух партыйнага таварыства. Давайце проста ўспомнім, калі мы з вамі былі ў гасцях адзін у другога, калі па партыйнаму аказалі дапамогу і падтрымку.

**Пятае.** Неабходна падумаць аб стварэнні партыйных груп у Савеце універсітэта, саветах факультэтаў. Выкарыстоўваць партыйныя групы для ўнясення і прыняцця патрэбных калектыву рашэнняў і праграм. Мне здаецца, што не трэба цягнуць з рашэннем гэтага пытання.

**Шостае.** З 1 верасня 1990 года дзейнічае «Закон аб мовах у Беларускай ССР». Ва універсітэце распрацавана мэтавая праграма па яго рэалізацыі. Партком, партыйная арганізацыя павінны ўнесці свой уклад ва ўзнаўленне беларускай мовы і культуры.

**Сёмае.** Наша універсітэцкая шматтыражная газета. Дапамога і ўплыў парткома на яе работу былі недастатковымі. Яўна не хапала там водгукаў нашых выкладчыкаў і студэнтаў на падзеі ў краіне. Парткому універсітэта неабходна ўзяць у свае рукі падпіску на газету. Яна практычна не праводзілася.

**На партыйным сходзе універсітэта прыняты Зварот да камуністаў Гродзеншчыны. Тэкст Звароту чытайце ў наступным нумары нашай газеты.**

# ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ РУСКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ МОЎ У ВНУ БЕЛАРУСІ

П. У. СЦЯЦКО

## Сучасны беларускі правапіс і заканамернасці развіцця беларускай мовы.

(ВЫТРЫМКІ З ДАКЛАДА, ТЭЗІСЫ ЯКОГА НЕ ДРУКАВАЛІСЯ).

...Наш сучасны правапіс шмат у чым эклектычны: побач з правіламі, якія замацоўваюць на пісьме заканамернасці нацыянальнай мовы, нямала і такіх, што расхістваюць, разбураюць іх...

Спецыфічная фанетычная заканамернасць беларускай літаратурнай мовы — аканне і яго разнавіднасць у пазіцыі пасля мяккіх зычных — яканне. Яны перадаваліся на пісьме ўжо ў 20 гады ў адпаведнасці з правапіснымі нормамі «Беларускай граматыкі для школ» Б. Тарашкевіча. Аднак у далейшым афіцыйныя колы прымаюць спецыяльную пастанову (1933 г.), дзе замацоўваецца напісанне літары О на месцы гука А ў ненаціскным становішчы: рэвалюцыя, комунізм, соцыялізм... І такое напісанне пратрымалася аж да 1957 года. Ды і цяпер яшчэ аддаецца даніна гэтаму: у канцы слова пасля галоснай захоўваецца напісанне О не пад націскам: Ватэрлоо, адажыо, трыо, Токіо.

Аканне — гэта і пераход не пад націскам гука Э ў гук А, што ў адпаведнасці з фанетычным прынцыпам беларускага правапісу адлюстроўваецца на пісьме: шэсць — шасці, шасцёра, шастак; шэры — шарэць; сэрца — сардэчны. Гэтая заканамернасць распаўсюджвалася і на іншамоўныя словы ўжо ў 20-я гады: адрас, адрасат, бухгалтар, латарэя, літаратура, майстар, рамеснік, сакрэт, сакратар, характарыстыка. Аднак у далейшым пашырэнне такога напісання на іншамоўныя словы было спынена. І таму насуперак вымаўленню мы пішам: шніцэль, камп ´ютэр і г. д.

Або каб правільна напісаць уласнае імя (асабовае, прозвішча ці геаграфічную назву) — з літарай А ці Э — у адпаведнасці з сучасным правапісам трэба ведаць, якой нацыянальнасці яго носьбіт, славянскае ці неславянскае гэта імя. Калі славянскае — маем права пісаць тут літару А: Гашак, Франак, Янак, Шаўчэнка, Шчадрын, калі неславянскае — пішы толькі Э: Герцэн Арэнбург. Ці разумна гэта? Ці такая бездапаможная наша мова, што нездатная яна засвоіць чужое слова, падпарадкаваць уласным заканамернасцям, зрабіць яго сваім? Так бяздумна адносіцца да свайго, нацыянальнага, роднага, неад ´емнага ад нас саміх, нельга! Правілу акання — фанетычнай і арфаграфічнай заканамернасці беларускай нацыянальнай мовы — павінны падпарадкоўвацца ўсе словы, не зважаючы на іх радаслоўную. Тым самым праца настаўніка і вучня будзе скіравана на само развіццё мовы, авалоданне ёю, а не высвятленне, сваё гэта слова, славянскае ці іншамоўнага паходжання. Акрамя таго, будзе знята лішняя да смешнага перашкода пры авалоданні пісьмовай беларускай моваю і тымі, хто вывучае яе, выконваючы Закон аб дзяржаўнасці беларускай мовы.

Яканне — пераход гукаў О, Э ў гук А пасля мяккіх зычных, што на пісьме абазначаецца літарамі Е, Ё — Я — у сучасным беларускім правапісе таксама распаўсюджваецца толькі на свае і славянскія словы, а іншамоўныя яму не падпарадкоўваюцца (як правіла); пішам вясна, зямля, зялёны, але: метал, легенда, сезон і г. д. І на гэты раз трэба правяраць пашпарт у чалавека, каб даведацца, хто ён — славянін ці не, каб па-беларуску правільна напісаць яго імя або прозвішча (як і ўласную назву геаграфічнага аб ´екта): з літарай Я — калі імя славянскае: Бялінскі, Няедлы, Бялград, з літарай Е, калі яно неславянскае: Неруда, Версаль. Аднак яшчэ ў 20-я гады, час адраджэння роднай мовы, неславянскага паходжання словы падпарадкоўваліся правілу якання: дзяжурны, ялейны, янот, яўрэй, яфрэйтар. Пазней украдкам сталі пісаць так і іншыя словы: каляндар, сяржант. Трэба, каб гэтае правіла распаўсюджвалася на ўсе без выключэння словы: лягенда, мядаль, сязон, мятровы. Бо розныя тут выключэнні не маюць пад сабою грунту. Пішучы метровы, слесарня, сцвярждаюць, нібыта гэтыя словы іншамоўныя, аднак у іх толькі корань не свой, а вытворная форма — беларуская, свая. Дык ці не пара адмовіцца ад такой практыкі, каб адныя іншамоўныя словы пісаць па-беларуску, а іншыя на іншамоўны лад.

А якая недарэчнасць, што паводле сучасных арфаграфічных даведнікаў трэба пісаць з літарай Е ў першым складзе перад націскам і такія спрадвечна беларускія словы, як дзевяты, дзесяты, васемнаццаць!

Славянскім мовам неўласцівае т. зв. «ззянне» галосных, таму ў межах адной марфемы галосныя, што стаяць побач, раздзяляюцца зычным. Гэтая фанетычная заканамернасць пашыраецца ў беларускай мове і на іншамоўныя словы: біёлаг (параўн. руск, биолог), геніяльны, сацыяльны... Аднак наш сучасны правапіс робіць выключэнне для пазіцыі ў пачатку і канцы слова, таму па-чужому мы павінны пісаць і казаць: Іарданія, трыо, хоць у «адліжныя» гады ўсё ж пісалі Іярданія, трыё (як і радыё).

Галосныя О—А, Е, Ё—Я ў складанаскарочаных словах наш сучасны правапіс раіць пісаць у апаведнасці з тым, якая літара пішацца ў поўным слове, адкуль бярэцца яго частка: сельмаг (сельскі магазін), лясгас (лясная гаспадарка). Затое насуперак гэтаму правілу ён патрабуе пісаць партком, райком, абком, хоць другая частка ўзята з поўнага слова камітэт, дзе гэтага О няма. Як бачым, і тут адхіленне ад агульнай заканамернасці не на карысць роднай мовы. Думаецца, што новыя сучасныя формы аграпрам, аблвыканкам узніклі, каб захаваць агульнае патрабаванне да напісання абрэвіятураў. Увогуле, можна было б прымаць абрэвіятуры за звычайныя словы, а не варыянты састаўных найменняў і падпарадкаваць напісанне ў іх галосных літараў правілам акання і якання. Зусім натуральна было б пісаць сяльмаг, як і лясгас.

Унармавання патрабуе не толькі ўласна арфаграфія, але і арфаграфічна-граматычнае напісанне многіх канчаткаў назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў. Тут у нас таксама не абышлося без занядбання спецыфічных рысаў літаратурнай мовы. Узяць хоць бы назоўнікі са значэннем асобы мужчынскага полу з канчаткам — а —я/мужчына, дзядуля, бацька, дзядзька/. Іх і ў самых апошніх па выданні дапаможніках для ВНУ залічваюць да жаночага склянення (як і ў рускай мове). Але хіба ва ўнармаванай беларускай мове існуюць такія формы: з бацькай, дзядзькай? Беларусы кажуць і пішуць: сустракаўся з Янкам Купалам, як і з дзядзькам Якубам, а не з Янкай Капалай, як гэта вынікае са сцверджання названых дапаможнікаў. Нарматыўным для беларускай мовы з ´яўляецца змяненне названых назоўнікаў у давальным, месным і творным склонах паводле слоў мужчынскага склянення (дзед, сын, унук). На жаль, у друку нярэдка пабачыш: прысвечана Ф. Скарыне, сустрэча з Ф. Скарынай. Так змяняюцца толькі словы са значэннем асобы жаночага полу: адрасавана Марыне Скарыне, сустрэча з Марынай Скарынай.

Да гэтага часу па-рознаму скланяюць і самі назоўнікі мужчынскага роду са значэннем асобы, асабліва ў месным склоне. У адпаведнасці з нормай трэба пісаць: пры/аб/ сыну, брату, дзеду. Аднак некаторыя слоўнікі з прэтэнзіяй на ўнармаванне ўсё ж падаюць: аб браце, дзедзе, г зн. нівелі́руюць спецыфіку беларускай мовы.

П. У. СЦЯЦКО.

## МЕТАДЫЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ — НА ПАРАДАК ДНЯ

Ажыўлены абмен думкамі і вопытам вёўся ў метадычнай падсекцыі 1. Удзельнікаў хвалявала многае: і змест лінгвістычных дысцыплін, і пытанні каардынацыі сумежных курсаў, і арганізацыя самастойнай работы, і правядзенне палявой практыкі студэнтаў.

Дацэнт нашага універсітэта М. А. Корчыц паказаў магчымы варыянт размеркавання матэрыялу ў курсах сучаснай рускай і беларускай моў з такім разлікам, каб пазбегнуць дубліравання тэм і, тым самым, больш увагі аддаць з ´явам, спецыфічным для кожнай з моў.

Вялікую зацікаўленасць слухачоў выклікаў даклад выкладчыка Мазырскага педінстытута В. Ф. Русецкага аб змесце і формах выкладання курса «Асновы культуры рускага маўлення» ва ўмовах беларуска-рускага двухмоўя. Дакладчык не толькі падзяліўся вопытам, а і паказаў свой вучэбны дапаможнік па курсу.

Пра асаблівасці правядзення дыялекталагічнай практыкі студэнтаў у Магілёўскім педінстытуце, з дэманстрацыяй фатаграфій і бюлетэня практыкі, расказала В. Б. Сузановіч. Аднадушна была прынята прапанова накіраваць праграму практыкі студэнтаў рускага аддзялення на збіранне фактаў з беларускіх гаворак. Гэта і больш карысна для настаўніка, які збіраецца працаваць у беларускай школе, і танней для дзяржавы, бо не трэба вазіць студэнтаў за межы рэспублікі.

Вялікую цікавасць выклікаў даклад С. У. Махоня, які пазнаёміў калег з працай калектыву кафедры рускай мовы Белдзяржуніверсітэта над пакетам праграм для выкарыстання машын «Лінгва» у выкладанні рускай мовы. Праграмы складаліся па ўсяму курсу сучаснай рускай мовы і выкарыстоўваюцца ўжо не адзін год. Вучоба ў класе праграмаванага навучання падабаецца студэнтам, эканоміць час выкладчыкаў і дае плённыя вынікі. Выкладчыкі рускай мовы Гродзенскага універсітэта мяркуюць выкарыстаць прапанаваныя праграмы (з пэўнай дапрацоўкай) у камп ´ютарным класе. Пачын ёсць: М. А. Корчыц і Ю. М. Вувунікян ужо зрабілі і апрабавалі некалькі праграм па сінтаксісу рускай мовы.

Ажыўленую дыскусію выклікаў даклад дацэнта БДУ Л. Р. Машчэнскай аб прынцыпах адбору практычнага матэрыялу для курсаў рускай і беларускай моў. На падставе сваіх назіранняў, пацверджаных эксперыментальна і статыстычна, дакладчыца выказала сумненне ў сіле міжмоўнай інтэрферэнцыі, якая, па падліках аўтара, складае ўсяго каля 7 працэнтаў ўсіх моўных памылак білінгва. Асноўная ж прычына кепскага маўлення — гэта проста няведанне мовы і няўменне ёю карыстацца. На вялікі жаль, не валодаюць культурай маўлення і выкладчыкі — прадметнікі.

Адзін са шляхоў развіцця маўлення вучняў і студэнтаў — гэта арыентацыя выкладчыка на пазіцыю «сістэ-

норма, якая супадае з сістэмай, не павінна патрабаваць да сябе асаблівай увагі. Карпатлівая праца пачынаецца тады, калі мы сутыкаемся з некалькімі сістэмнымі магчымасцямі мовы. Увага да варыянтаў на ўсіх узроўнях моўнай сістэмы, шлях ад ядзерных адзінак да перыферыйных, функцыянальны падыход, які ўжо даўно ажыццяўляецца пры выкладанні замежных моў, — вось асноўны напрамак выкладання рускай і беларускай моў. З гэтай думкай згадзіліся многія прысутныя на секцыі.

Р. А. Чычынскайтэ з Вільнюскага універсітэта расказала пра змест паэтычнага слова ў спецкурсе для студэнтаў-русістаў. Галоўная думка дакладчыцы: паэтычнае слова ў культуралагічным аспекце, якое супрацьстаіць слову ў аспекце яго прадузятай ідэалагізацыі, слова-арганізм, слова-архетып, «слово-плоть» (О. Э. Мандельштам) — гэта слова аб ´ёмнае, актыўнае, якое дапамагае ачалавечыць навакольны свет.

Вельмі зацікавіў калег даклад ленінградскага вучонага Л. І. Харчанкавай (педінстытут імя А. І. Герцэна) аб сувязі выкладання мовы з духоўнымі каштоўнасцямі народа — носьбіта мовы. Дакладчыца прадэманстравала некалькі форм работы і паказала іх вынікі ў гэтым напрамку пад час правядзення педагагічнай практыкі студэнтаў. Пры гэтым яна выказала меркаванні і сваё бачанне вывучэння мовы некаторых беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, тым самым выявіла не толькі дасведчанасць у сучаснай беларускай літаратуры, але і павагу да беларускіх калег.

У заключэнне прафесар Л. В. Судавічэне, старшыня секцыі, падзялілася з прысутнымі вопытам арганізацыі вучэбнага працэсу ў Вільнюскім універсітэце. Нягледзячы на розныя традыцыі і цяперашнія сітуацыі ў Літве і Беларусі, некаторыя пачыnанні літоўскіх калег могуць прыжыцца і ў нас. Напрыклад, больш смелы перавод многіх другасных дысцыплін на факультатыўнае вывучэнне, арганізацыя некаторых спецкурсаў і спецсемінараў для студэнтаў некалькіх факультэтаў, двухступенчаты прыём уступных экзаменаў і г. д.

Канешне, канферэнцыя абмеркавала далёка не ўсе праблемы, якія намячаліся аргкамітэтам. Неяк да канца не быў абмеркаваны змест дзяржаўнага экзамену, хоць яму і быў прысвечаны даклад прафесара А. І. Яновіч, дарэчы, адзін даклад па гэтай праблеме. Факультэты зноў павінны самастойна выпрацоўваць аб ´ём, змест і форму правядзення дзяржаўнага экзамену.

На жаль, не ў той меры, як хацелася, удзельнічалі ў канферэнцыі вучоныя-беларусісты. Так склалася, што ў падсекцыі І гучала ў асноўным руская мова, хоць праблемы, якія абмяркоўваліся, тычыліся і беларускамоўных курсаў.

І ўсё ж такі канферэнцыя ўдалася. Калегі падзяліліся вопытам, трывогамі, паспрачаліся, выпрацавалі аптымальныя падыходы ў методыцы выкладання моў, акрэслілі планы на будучае.

М. КАНЮШКЕВІЧ,
загадчыца кафедры рускай

## ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА

**У Омскім універсітэце пры непасрэдным удзеле студэнтаў адкрыўся Цэнтр вывучэння законаў развіцця грамадства. Асноўнымі напрамкамі яго дзейнасці з ´яўляюцца:**

**— знаёмства з новымі навуковымі падыходамі да праблем дзяржавы, грамадства, права;**

**— прапановы найбольш канструктыўных, на наш погляд, варыянтаў далейшага развіцця краіны;**

**— распрацоўка арыгінальных палітычных тэорый, своеасаблівых канцэпцый эканамічнага, экалагічнага, сацыяльнага развіцця планеты;**

**— разважанні аб будучым, навукова абаснаванае прагназіраванне будучага светаўтварэння.**

**Першачарговай мэтай стварэння данага Цэнтра з ´яўляецца ўстанаўленне сувязяў паміж студэнтамі, якіх цікавяць пытанні палітыкі, новыя прынцыпы грамадскага развіцця і дзяржаўнага ўстройства. У ходзе завочнай дыскусіі паміж студэнтамі, якая можа праводзіцца ў форме перапіскі, могуць быць распрацаваны самыя арыгінальныя тэарэтычныя канцэпцыі, якія паслужаць асновай адзінай усесаюзнай студэнцкай праграмы дзеянняў.**

**Дарагія студэнты! Цэнтр вывучэння законаў развіцця грамадства прапаноўвае супрацоўніцтва ўсім жадаючым. Удзельнічаючы ў рабоце Цэнтра, вы пазнаёміцеся з новымі палітычнымі і эканамічнымі канцэпцыямі, прымеце актыўны ўдзел у іх распрацоўцы. У ходзе завочнай дыскусіі будуць выпрацаваны асноўныя напрамкі далейшай дзейнасці.**

**Усіх, каго цікавяць пытанні палітыкі, дзяржавы, грамадства, мы просім напісаць нам. У пісьме коратка раскажыце пра сябе, пра свае палітычныя погляды, калі лічыце патрэбным — аб мэтах. Зваротным пісьмом мы пачнём нашу сумесную работу.**

**Наш адрас: 644077 г. Омск-77, пр. Міра, 55 А, Омскі універсітэт, Цэнтр вывучэння законаў развіцця грамадства.**

**Ініцыятыўная група студэнтаў**

# «ЧАЛАВЕК І ЭКАНОМІКА»— ЧАСОПІС ДЛЯ ЎСІХ

Новы грамадска-палітычны і эканамічны часопіс Дзяржаўнага камітэта БССР па эканоміцы і планаванню і Савета федэрацый прафесіянальных саюзаў Беларусі «Человек и экономика», як выцякае са зварота яго рэдкалегіі да чытачоў, ставіць перад сабой мэту дапамагчы ім глыбей усвядоміць палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя праблемы рэспублікі, ход перабудовы ва ўсёй яе складанасці, адчуць пульс грамадскага жыцця, клопаты простага чалавека, яго інтарэсы і патрэбы. На старонках выдання можна будзе пазнаёміцца з самымі рознымі, як цяпер гавораць, альтэрнатыўнымі думкамі і меркаваннямі аб тым, куды мы ідзем і што з намі будзе, навуковых работнікаў і арганізатараў вытворчасці, грамадскіх дзеячаў і людзей, не вельмі спакушаных у эканамічных тэорыях, затое маючых уласны бясцэнны прафесіянальны і жыццёвы вопыт.

Глыбокі сэнс нашых палітычных і эканамічных рэформ заключаецца у тым, каб людзі не на словах, а на справе сталі гаспадарамі на вытворчасці, у сваіх сёлах і гарадах, у сваёй рэспубліцы. Але гаспадаром можа быць толькі той, хто валодае інфармацыяй, ведамі, хто ўмее думаць эканамічна. У часопісе вы знойдзеце палітычныя і эканамічныя прагнозы, аналітычныя матэрыялы, самую дакладную інфармацыю, неабходную для практычнай работы і для вучобы, атрымаеце адказы на пытанні аб формах уласнасці і іх узаемадзейнасці, аб тым, як стаць прадпрымальнікам і аб сацыяльных гарантыях... Прычым атрымаеце ад самых кваліфікаваных эканамістаў, менеджэраў, юрыстаў, прафсаюзных лідэраў.

Часопіс «Человек и экономика» — выданне масавае, а гэта значыць, што на яго старонках можна даведацца не толькі пра праблемы эканомікі або прафсаюзнай работы, кіравання народнай гаспадаркай, навукі і тэхнікі, але і пра сакрэты дамашняй кухні, пазнаёміцца з таямнічымі НЛА, захапіцца вострасюжэтным дэтэктывам або фантастычнай аповесцю, падумаць над парадамі гараскопа... Словам, чытайце і выпісвайце часопіс «Человек и экономика». Кошт падпіскі — 6 рублёў на год, на паўгоддзе — 3 рублі. Індэкс — 74986.

# ПРАЦА + МІЛАСЭРНАСЦЬ

Паважаныя чытачы! Падпісаўшыся на гэтыя два выданні, вы патраціце са свайго бюджэту ўсяго толькі 9 рублёў. Затое вы будзеце рэгулярна атрымліваць самую праўдзівую інфармацыю аб падзеях у жыцці рэспублікі і за яе межамі, на вашым стале заўсёды будзе ляжаць праграма тэлебачання на тыдзень. Рэдакцыя прадугледжвае таксама выдаваць брашуры на прававую тэматыку, дзе ў папулярнай форме будуць растлумачвацца новыя законы, парадак іх прымянення. Падпісчыкі змогуць набыць гэту літаратуру на льготных умовах.

Газета застаецца вернай сваім пазіцыям і ў далейшым будзе адстойваць на сваіх старонках інтарэсы простых людзей, смела выступаць за сацыяльную справядлівасць. У рэдакцыі ствараецца група незалежных прафесіянальных экспертаў, якая будзе аператыўна аналізаваць прымаемыя ўрадам СССР і БССР пастановы, указы, праекты законаў, іншыя ўрадавыя дакументы з пункту гледжання іх карысці для ўсіх.

Але паверце — змагацца за праўду, за жыццё добрасумленна, супраць бюракратыі і падману ў адзіночку вельмі складана. Таму «Праца» разлічвае на вашу, паважаныя падпісчыкі, падтрымку. Індэкс газеты 63855, цана на год — 7 руб. 20 кап., паўгоддзе — 3.60, квартал — 1.80, месяц — 60 кап.

Што датычыцца штомесячнага ілюстраванага дадатку на рускай мове «Милосердие» (індэкс 74959) цана на год — 1 руб. 80 кап., то ў ім будзе расказвацца пра дабрачынную дзейнасць у рэспубліцы. На яго старонках пойдзе размова аб забытай старасці і сіроцтве, галечы і беспрацоўі... — безрабоціцы, аб тым, як хоць крыху аблегчыць жыццё тым, хто мае патрэбу ў міласэрнасці, як трэба гэтага дабівацца, аб вопыце дабрачыннай дзейнасці ў іншых краінах. Прыбытак ад выдання газеты пойдзе на дабрачынныя мэты — канкрэтнаму дзіцячаму дому або дому для састарэлых і інвалідаў, малазабяспечанай мнагадзетнай сям'і, дзіцяці, якое мае патрэбу ў лячэнні.

Газета спадзяецца, што і прафсаюзныя камітэты паклапоцяцца аб падпісцы на «Працу» і «Милосердие» для пенсіянераў, малазабяспечаных людзей на льготных умовах, а то і зусім бясплатна.

За дадатковай інфармацыяй звяртайцеся, калі ласка, у прэс-цэнтр аб'яднання прафсаюзаў Гродзенскай вобласці па тэл. 44-13-40.

# Пераможца конкурсу—Арыядна



Пераможцай конкурсу «Новая мадэль сёння — 1990» стала 16-гадовая Арыядна Кваст з Рыгі.

**Конкурс упершыню быў праведзены ў 1986 годзе ў Італіі, у горадзе Салерна. Яго арганізатарамі былі мінстэрства турызму і забаў Італіі і ўлады адміністрацыйнай вобласці Кампанія, а таксама шэраг вядучых італьянскіх фірм. У Савецкім Саюзе конкурс «Новая мадэль сёння» быў праведзены ўпершыню ў рамках нацыянальнага фіналу.**

**У барацьбу за ўдзел у савецкім нацыянальным фінале ўступілі каля паўтары тысячы прэтэндэнтак, якія прыслалі свае анкеты і фотаздымкі ў маскоўскі маладзёжны цэнтр. У фінале конкурсу прынялі ўдзел 30 дзяўчат з 10 гарадоў СССР. Шэсць канкурсантак, сярод якіх і пераможца Арыядна Кваст, запрошаны на міжнародны фінал у Італію.**

**На здымку: пераможца конкурсу «Новая мадэль сёння — 1990» АРЫЯДНА КВАСТ з Рыгі.**

**Фота В. ХРЫСТАФОРАВА (Фотахроніка ТАСС).**

ПАРАДЫ МЕДЫКА

# *БУДЗЬЦЕ АСЦЯРОЖНЫЯ — БАТУЛІЗМ*

Наступіла пара асенняга кансервавання харчовых прадуктаў. Аднак кансерваваныя прадукты могуць быць прычынай такога захворвання як батулізм. Захворванне ў асноўным выклікаецца кансерваванымі прадуктамі, прыгатаванымі ў хатніх умовах. Гэта, у першую чаргу, грыбы, кансерваваныя ў герметычна закрытых слоіках, рыба, агародніна, мясныя кансервы.

Асабліва небяспечная агародніна і садавіна хатняга прыгатавання, якія закансерваваныя з парушэннем тэхналогіі, агуркі, кабачковая ікра, перац фаршыраваны, мясныя кансервы (вяндліна, шынкі, кілбаса).

Батулізм — гэта вострае захворванне, якое адносіцца да харчовых атручванняў. Узбуджальнікі батулізма — мікробы, якія жывуць без доступу кісларода. У кансерваваных прадуктах, герметычна закупораных, а таксама ўнутры вяндліны, шынкі ці кілбасы гэтыя мікробы ўтвараюць моцны яд. Гэты яд і выклікае цяжкае атручванне, якое, калі позна звярнуцца за медыцынскай дапамогай, можа прывесці да смерці.

Споры мікробаў вельмі ўстойлівыя да розных фізічных і хімічных уздзеянняў, яны могуць доўгі час, нават дзесяцігоддзямі, захоўвацца ў зямлі, у страўніку рыб, птушак і хатніх жывёл і адтуль трапляюць на харчовыя прадукты. Таму дрэнна вымытыя агародніна ці грыбы, кансерваваныя ў хатніх умовах без захоўвання санітарна-гігіенічных правіл, могуць стаць прычынай харчовага атручвання людзей. Трэба памятаць і яшчэ аб адной асаблівасці гэтых мікробаў і іх таксіну: яны не мяняюць знешняга выгляду, паху, колеру пашкоджаных прадуктаў.

Батулізм па свайму цячэнню не заўсёды нагадвае харчовае атручванне, таму што растройства страўніка можа і не быць, а такія сімптомы, як агульнае недамаганне, вяласць, сухасць у роце, адчуванне смагі, з'яўляюцца ўжо праз 8—12 гадзін пасля яды, хворы звязвае гэта з усім, але не з выкарыстаннем хатніх кансерваваных прадуктаў. У канцы першых сутак ад пачатку захворвання з'яўляюцца больш грозныя сімптомы. Хворы дрэнна бачыць, перад вачыма «заслона», рэчы пачынаюць падвойвацца, становіцца цяжка глытаць, парушаецца мова, слабасць павялічваецца, павышаецца тэмпература. Хворы скардзіцца на «заміранне сэрца», растройства дыхання, прычынай якога з'яўляюцца пашкоджанні міжроберных мышцаў.

Калі хворы своечасова не звернецца да ўрача і не атрымае спецыфічнага лячэння (увядзенне супрацьбатулінічнай антытаксічнай сывараткі), смерць пры яснай свядомасці можа наступіць на 2—3 дзень захворвання. Трэба ўлічваць вялікую небяспечнасць, бо ўсе хворыя батулізмам, незалежна ад цяжкасці захворвання, павінны быць абавязкова гаспіталізаванымі. Смяротнасць часцей назіраецца ў тых выпадках, калі батулізм выкліканы кансервамі з агародніны, садавіны ці грыбоў. З мясных прадуктаў хатняга прыгатавання найбольшую небяспечнасць у адносінах да гэтага захворвання ўяўляюць сыравэнджаныя шынкі.

Як жа папярэдзіць батулізм? Як зрабіць, каб хатняя нарыхтоўка агародніны, садавіны, грыбоў і мяса прыносіла карысць, а не бяду?

Каб пазбегнуць захворвання батулізмам, трэба прытрымлівацца наступных правілаў:

— нельга купляць на базары і выкарыстоўваць у страву неправераныя прадукты хатняга прыгатавання, у тым ліку грыбы і вяндліну;

— для кансервавання ў хатніх умовах трэба браць толькі непашкоджаныя плады і добра іх мыць;

— нельга кансерваваць грыбы ў слабасалёных і слабакіслых марынадах (у так званым асабістым соку). Саленне і марынаванне трэба праводзіць у бочках, слоіках (не закрываючы іх герметычна), дабаўляць соль з разліку 2 сталовыя лыжкі на 1 літр вады і 2 сталовыя лыжкі 80-працэнтнай эсэнцыі на 1 літр грыбоў. Прычым эсэнцыю дабаўляць не ў кіпячы марынад, а непасрэдна ў слоікі ці бочкі;

— захоўваць прадукты хатняга кансервавання трэба пры тэмпературы не вышэй +10 градусаў у сухім памяшканні;

— нельга выкарыстоўваць у страву прадукты з слоікаў з уздутымі пакрышкамі, нават калі яны прыгатаваны ў вытворчых умовах і куплены ў магазіне;

— за 6—12 гадзін да яды рэкамендуецца пракіпяціць хатнія кансервы на працягу 15—20 мінут;

— пасля працяглага захавання сыравэнджаных кумпякоў, перад падачай на стол іх лепш падсмажыць ці адварыць.

**В. Пракаповіч,**
**старшы выкладчык кафедры асноў медыцынскіх ведаў і аховы здароўя дзяцей, кандыдат медыцынскіх навук.**

Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшка, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня
вул. Паліграфістаў, 4.

Зак. 7991
Тыраж 2000 экз.

Рэдактар
Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ.